# УЛАДЗІМІР ІВАНАВІЧ ПІЧЭТА
## (Да 100-годдзя з дня нараджэння)



Уладзімір Іванавіч Пічэта. Першы рэктар Беларускага дзяржаўнага універсітэта, першы заслужаны прафесар БССР, адзін з арганізатараў Інстытута беларускай культуры, ініцыятар стварэння Акадэміі навук БССР і першы беларускі акадэмік, вядомы грамадскі дзеяч Савецкай Беларусі, выдатны савецкі вучоны-гісторык, адзін з заснавальнікаў беларускай савецкай гістарычнай навукі. Аўтар пяцісот навуковых прац па гісторыі Расіі, Беларусі, Украіны, Літвы, Узбекістана, Польшчы, Чэхіі, Балгарыі і іншых краін. Многія працы вядомы не толькі ў нашай краіне, але і за яе межамі.

У. І. Пічэта (1878—1947) пражыў вялікае і цікавае жыццё. Усебакова адукаваны чалавек, нястомны даследчык, ён прайшоў складаны працоўны шлях ад настаўніка сярэдняй школы да правадзейнага члена Акадэміі навук СССР.

Цэнтральнае месца ў творчай спадчыне У. І. Пічэты займалі пытанні гісторыі Беларусі. Гэтай тэме прысвечана каля 150 навуковых прац. Цяжка назваць якое-небудзь пытанне па гісторыі Беларусі ад перыяду першабытна-абшчыннага ладу да пачатку XX стагоддзя, якое ў той ці іншай меры не было даследавана У. І. Пічэтам. Праблема паходжання беларускага народа, гісторыя сацыяльна-эканамічнага развіцця і гісторыя права Беларусі, гісторыяграфія, крыніцазнаўства і этнаграфія, гісторыя беларускай культуры і вышэйшай школы на Беларусі, археалогія і краязнаўства, педагогіка і архіўная справа — усё гэта было прадметам даследавання ў працах вучонага.

Вывучэннем гісторыі Беларусі У. І. Пічэта пачаў займацца яшчэ да Кастрычніцкай рэвалюцыі. Так, у 1909—1910 гг. выходзяць у свет яго артыкулы «Літоўска-польскія уніі і адносіны да іх літоўска-рускай шляхты» і «Літоўска-руская дзяржава». У 1917—1918 гг. У. І. Пічэта апублікаваў сваё самае буйное даследаванне «Аграрная рэформа Сігізмунда-Аўгуста ў Літоўска-Рускай дзяржаве», якое займае асобнае месца ў беларускай гісторыяграфіі не толькі па багаццю змешчанага ў ім матэрыялу, але і таму, што яно з'явілася адпраўным пунктам для шэрагу іншых прац, якія развівалі і ўдакладнялі вылучаныя ў ёй палажэнні.

Асабліва вялікі ўклад унёс вучоны ў вывучэнне аграрнай рэформы 1557 г. Погляды У. І. Пічэты на асноўныя пытанні рэформы з цягам часу якасна мяняліся. Пераадоленне памылковых канцэпцый дзяржаўнай школы і ўплыву эканамічнага матэрыялізму, засваенне марксісцка-ленінскай метадалогіі, фундаментальная крыніцазнаўчая база, у тым ліку ўвядзенне ў навуковы зварот Пісцовых кніг, якія склалі гаспадарскія

рэвізоры пры перабудове гаспадаркі вялікакняскіх двароў, дазволілі яму глыбока і правільна выявіць прычыны, ход і прыгонніцкую накіраванасць аграрнай рэформы 1557 г. у Беларусі.

Працы У. І. Пічэты прадстаўляюць першую ў савецкай гістарычнай навуцы спробу даследавання сацыяльна-эканамічнага становішча сялянства Беларусі і Літвы ў XV— першай палове XVII ст. У параўнанні са сваімі папярэднікамі ён якасна ўдакладніў уяўленне аб структуры сялянскага насельніцтва. Першым з гісторыкаў, якія вывучалі Вялікае княства Літоўскае, У. І. Пічэта паставіў у цэнтры ўвагі працэс запрыгонення, які вызначыў лінію гістарычнага развіцця сялянства ў эпоху феадалізму.

8 ліпеня 1921 г. У. І. Пічэта назначаецца першым рэктарам Беларускага дзяржаўнага універсітэта.

Дзейнасць У. І. Пічэты ў БДУ была вельмі разнастайнай. Уся яго праца па арганізацыі універсітэта, яго навукова-педагагічная дзейнасць, падрыхтоўка соцень першых высокакваліфікаваных спецыялістаў для народнай гаспадаркі, навукі і культуры Савецкай Беларусі — гэта высокі, самаадданы подзвіг вучонага, грамадзяніна, патрыёта.

У 1939 г. у Інстытуце гісторыі АН СССР быў створан сектар славяназнаўства, а на гістарычным факультэце МДУ — кафедра гісторыі паўднёвых і заходніх славян. Сектар і кафедру ўзначаліў У. І. Пічэта, які ў 1939 г. быў выбраны членам-карэспандэнтам АН СССР, а ў 1946 г.— акадэмікам.

Навуковая і грамадска-палітычная дзейнасць У. І. Пічэты былі высока ацэнены Савецкім урадам, які ўзнагародзіў яго ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга і медалём «За доблесную працу ў Вялікай Айчыннай вайне».

Але не менш чым гэтымі ўзнагародамі акадэмік У. І. Пічэта ганарыўся тым, што яго кнігі і артыкулы чытаў Уладзімір Ільіч Ленін, што многія з іх захоўваюцца ў асабістай бібліятэцы У. І. Леніна ў Крамлі. Трэба адзначыць, што Уладзімір Ільіч, праглядаючы вялікую колькасць кніг пакідаў у сваёй асабістай бібліятэцы толькі найбольш важныя з іх. Сярод гэтых кніг знаходзяцца працы У. І. Пічэты «Уводзіны ў рускую гісторыю» (Крыніцы і гісторыяграфія), 1923, «Гісторыя народнай гаспадаркі Расіі XIX—XX ст.ст. Пачатак індустрыялізацыі і разлажэнне прыгоннай гаспадаркі» (1923), а таксама «Працы Беларускага дзяржаўнага універсітэта ў Мінску» № 1 і № 2—3 за 1922 г., дзе змешчаны артыкулы У. І. Пічэты «Валочная ўстава каралевы Боны і ўстава на валокі» і «Наказ старастам і дзяржаўцам і валочная ўстава». На тытульным лісце першага выпуску «Прац БДУ» ёсць надпіс: «Уладзіміру Ільічу Леніну ад Беларускага дзяржаўнага універсітэта», а другога-трэцяга выпуску «Прац БДУ» — надпіс «У. І. Леніну ад БДУ».

У 1929 г. У. І. Пічэта пісаў: «Я не выпадкова папаў на тэрыторыю Беларусі. Я аддаў усе свае сілы і сваю энергію працоўным масам Беларусі. Я вельмі цесна да канца жыцця звязаны з імі».

Уся творчая праца У. І. Пічэты дастойна таго, каб яго імя заставалася ў памяці беларускага народа, у гісторыі беларускай навукі.

**Э. Р. Іофе.**